На адной хвалі

# На тэлеэкране — «Славянскі базар 2024»

**Ужо праз некалькі дзён, з 9 да 14 ліпеня, гасцей і ўдзельнікаў ізноў будзе прымаць XXXIII Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Назіраць за найбольш яркімі падзеямі летняга культурнага форуму традыцыйна ўсе ахвотныя змогуць і ў тэлеэфіры.**




Так, падчас фестывалю на тэлеканале «Беларусь 1» нас будуць чакаць «Дзённікі фестывалю» пасля праграмы «Панарама». Сачыць за падзеямі свята зможам і ў выпусках культурных навін. Не застанемся мы і без трансляцый знакавых канцэртных праграм. Урачыстае адкрыццё на «першай кнопцы» сваёй аўдыторыі прадставяць у вячэрнім эфіры (у 22.00) у чацвер, 11 ліпеня. А ў пятніцу, 12 ліпеня, у гэты ж час там пакажуць гала-канцэрт «Саюзная дзяржава запрашае...». Урачыстае закрыццё фестывалю на тэлеэкранах нас чакае ў нядзелю 14 ліпеня ў 21.00. Гэты канцэрт будзе ўключаць у сябе выступленні другога конкурснага дня ўдзельнікаў XXXIII Міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск-2024», дзе ў іх выкананні мы пачуем сусветныя хіты.

На тэлеканале «Беларусь 3» запланаваны для тэлеаўдыторыі трансляцыі XXII Міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу «Віцебск» 10 і 11 ліпеня ў 14.00. І ў такі ж час 12 ліпеня цырымонія ўзнагароджання пераможцаў Міжнароднага дзіцячага музычнага конкурсу і гала-канцэрт з удзелам міжнароднага журы. А вось конкурснае спаборніцтва ўдзельнікаў XXXIII Міжнароднага конкурсу выканаўцаў эстраднай песні «Віцебск-2024», дзе прадстаўнікі з розных краін выступяць са «Славянскім хітом», зможаце паглядзець у суботу, 13 ліпеня, на тэлеканале «Беларусь 1». Сачыце за тэлепраграмай і плануйце прагляды тых мерапрыемстваў, дзе з задавальненнем будзеце бавіць час пад гукі любімых мелодый.

**Алена ДРАПКО.**

## ШАШКІ

**(«Звязда»)** Выпуск № 221

**З 15 да 17 чэрвеня ў Гродне прайшла Рэспубліканская спартакіяда школьнікаў. Перамагла каманда Віцебскай вобласці (Дар'я Нарчук, Іван Невар, Арцём Гутан, Анастасія Бутаровіч). На другім месцы — Мінск, на трэцім — Магілёўская вобласць.**

8 чэрвеня 85-гадовы юбілей адзначыў Барыс Міхайлавіч Плоткін — майстар спорту, сярэбраны прызёр чэмпіянату Беларусі 1960 года па стаклетачных шашках.

№ 100



№ 100 В. Варушыла (Мінск)

**Белыя простыя:** e1, b2, e3, g3, d4, f4, e5, g5 (8)

**Чорныя простыя:** h2, c3, a5, h6, c7, e7, g7 (7)

№ 101 Ю. Мурадаў (Барысаў)

**Белыя простыя:** e1, g1, d2, f2, h4 (5)

**Чорныя простыя:** h2, b4, d4, g5, b6, f6, e7, g7, h8 (9)

№ 102 Я. Кандрачэнка (Гомель)

**Белыя простыя:** a1, b2, f2, c3, e3, e5, b6 (7)

**Чорныя простыя:** a5, g5, h6, a7, c7, g7, d8, f8 (8)

№ 103 В. Арцюхін (Мінск)

**Белыя простыя:** d2, g3, f4, g5 (4)

**Чорныя простыя:** h2, e3, b4, c7, e7, g7 (6)

Астатнія кампазіцыі па правілах бразільскіх шашак склаў Г. Андрэеў.

№ 104

**Белыя простыя:** b2, f2, h2, c3, f6 (5)

**Чорныя простыя:** d4, f4, h4, e5 (4)

№ 105

**Белыя простыя шашкі:** a1, d2, c3, d4, c5, a7 (6)

**Чорныя простыя шашкі:** a3, g3, f4, h4, f6, e7 (6)

№ 106

**Белыя простыя шашкі:** c1, g1, c3, d4, c5, b6, g7 (7)

**Чорныя простыя шашкі:** f2, e3, g3, h6, e7, b8 (6)

Ва ўсіх пазіцыях белыя пачынаюць і выйграюць. Прозвішчы чытачоў, якія дашлюць правільныя адказы, будуць апублікаваныя.

Анонс. З 15 да 19 ліпеня ў аг. Жыровічы (Слонімскі раён) адбудзецца XIV Рэспубліканскі турнір па шашках-100, прысвечаны Дню вызвалення Слоніма.

Праверце свае рашэнні:

Выпуск № 220 ад 21.06.24.

№ 93 1. b4-c5 d6:d2 2. d4-b6 a7:c5 3. e5-d6 c7:e5 4. f4:c1 h2:f4 5. c1:b4 a5:c3 6. f2-g3 h4:f2 7. g1:e3+

№ 94 1. c3-d4 e5:c3 2. e3-f4 g3:e5 3. c5-d6 e7:c5 4. a3:g3 h2:f4

[ 4...h4:f2 5. g5:e7 f8:d6 6. e1:g3 h2:f4 7. h6:g5 ]

5. g5:e7 f8:d6 6. h6:h6 h4-g3 7. h6-e3 g3-h2 8. e3-g1 c7-b6 9. g1:a7 h2-g1 10. e1-f2+

№ 95 1. a3-b4 c3:a5 2. c5-a3 e7:c5 3. a3:b4 a5:c3 4. g5:e7 f8:d6 5. h6:f4 b8-a7 6. f4-c7+

№ 96 1. c5-b6 e7:a7 2. g5:e7 f8:d6 3. h6:g1 a7-b8 4. g1-h2+

№ 97 1. 22-17 12:32 2. 23:03 34:45 3. 03:20 15:22 4. 44-40 45:34 5. 43-39 34:43 6. 49:09 10-14 7. 09:20 25:14 8. 48-43+

№ 98 1. 29-23 12:32 2. 26:45 18:29 3. 45:05 32:23 4. 05:49+

№ 99 1. 18-13 09:29 [ 1...24:21 2. 38:47 21:49 3. 47-33 40-45 4. 33-50 ]

2. 28-23 29:18 3. 38-42 24:47 4. 43-38 47:11 5. 06:22 40-45 6. 22-50+

Першымі дакладныя адказы даслалі: В. Арцюхін, Э. Дамброўскі, П. і В. Шульгі (усе — Мінск), С. Рашэцін (Ашмяны), В. Таўкачоў (в. Уздзевічы Клімавіцкага р-на Магілёўскай вобл.), Ф. Карпей, Л. Жыхар (абодва — Мядзель), У. Панько (Камянец), І. Ананіч (Гродна).

**Пішыце па адрасе: газета «Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, e-mail: info@zviazda.by або vorush@yandex.ru**

**Віталь ВАРУШЫЛА, майстар спорту.**





ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Сядзі і глядзі

# ВЫБАР ВЫЗНАЧАЕ ЖЫЦЦЁ

**Прыхільнікаў беларускага кінематографа зноў парадуюць сваімі прапановамі тэлеканалы, дзе працягваюць дэманстраваць мастацкія кінастужкі «Беларусьфільма» розных гадоў. І ў найбліжэйшыя выхадныя там кожнаму знойдзецца што паглядзець.**

Так, у праграме сацыякультурнага тэлеканала значыцца паказ камедыйнай меладрамы «Цешча», знятай рэжысёрам Сяргеем Сплашновым у 1973 годзе. Кінастужка дае магчымасць назіраць за ўзаемаадносінамі герояў, характары якіх раскрываюцца ў кантэксце шэрагу пабытовых сітуацый. Увасабляюць персанажаў на экране майстры кіно Павел Кармунін, Тацццяна Карпава, Галіна Фядотава, Аляксандр Удовін, Павел Малчанаў, Стэфанія Станюта і іншыя. У кінастужкі, дарэчы, было дзве спробы з'яўлення на свет. Першапачаткова «Цешча» магла мець зусім іншую каманду, якая стварала яе, і рэжысёрам выступаў Гарнік Азаран — яго запрыкмецілі пасля фільма «Ажаніліся стары са старой» (1971 г.). Аднак кінамайстар не прыжыўся, і, калі давялося фільм здымаць нанова, то гэта даверылі ўжо кінавытворцам на чале з Сяргеем Сплашновым. Вынік таго, што атрымалася і засталося ў гісторыі, ацэньваць гледачам, таму глядзіце, каб вярнуцца ў атмасферу Мінска 1970-х гадоў і параўнаць, ці так моцна змяніліся людзі і іх уяўленні аб жыцці. Не прапусціце вячэрні паказ на канале «Беларусь 3» у суботу 6 ліпеня.

А вось на тэлеканале «НТБ-Беларусь» у найбліжэйшыя дні нам пакажуць драму «Нядзельная ноч» (1977 г.) і кінааповесць «Таму што люблю» (1974 г.). Першы фільм — праца Віктара Турава, дзе рэжысёр распавядае трагічную гісторыю людзей адной вёскі. У цэнтры — паказальны судовы працэс, які стаў фіналам няпростых узаемаадносін галоўных герояў і наступствам учынку на п'яную галаву аднаго з іх. Праўда, выязны суд апраўдвае герояў, бо вінаватымі, па меркаванні прававсуддзя, варта лічыць не толькі тых, каго наўпрост закранула сітуацыя... Кінастужка падымае шмат актуальнага ва ўсе часы, калі чалавек, здавалася б, сам стварае свой лёс. Але ці варта быць бяздзейнымі тым, хто аказваецца побач? Належыць адзначыць, што актрыса Людміла Зайцава (выканаўца ролі суддзі) атрымала прыз за найлепшую жаночую ролю на Усесаюзным фестывалі (СССР, 1977 г.) і там жа адзначылі спецыяльным прызам журы і рэжысуру Віктара Турава. Такое кіно варта паглядзець, таму плануйце кінасеанс у суботу днём 6 ліпеня.

І кінааповесць «Таму што люблю» ад рэжысёра Ігара Дабралюбава, якая ўбачыла свет паўстагоддзя таму, таксама прыклад кіно, дзе гучаць вечныя і актуальныя ў розныя часы тэмы. Найперш чалавечага выбару і шчасця. Герой Генадзя Каралькова (лётчык Мураўёў), маючы каханне і любімую справу, у жыцці ў пэўны момант аказваецца перад складаным выбарам...



Такі часам лёс сапраўдных мужчын, калі яны мараць пра перспектывы, і, у прыватнасці, палярных лётчыкаў. Праўда, як адзначаў сам рэжысёр, кінастужка на этапе стварэння вельмі пацярпела, бо сюжэтныя лініі і драматургія былі зменены цэнзурай: «Нягледзячы на тое што кансультантам фільма быў маршал авіяцыі Скрыпко, да мяне прыйшоў узброены нажніцамі чыноўнік з ваеннай цэнзуры, сеў і пачаў прафесіянальна рэзаць гатовую карціну прама ў мяне на вачах. Сэрца маё сцiскалася... Я не вытрымаў і сышоў. Ён дарэзаў усё, што хацеў, я толькі паглядзеў потым, што засталося, — складзі з гэтага нават прыблізна добрую карціну было немагчыма»... І ўжо Анатоль Забалоцкі пазней адзначыць на мастацкім савеце: «Лёсы людскія зусім не кранаюць. Іх вядзе сюжэт, а не жыццёвая непаўторнасць. Цікавыя па глядацкай інфармацыі перспектывы з выкарыстаннем глыбіні-рэзкасці з дапамогай дыяфрагмы. Толькі адчуваецца, што ўсе гэтыя цудоўныя кадры зарэзаны падчас мантажу». А значыць, і сучаснаму гледачу будзе цікава пашукаць усе тыя загадкі «паміж радкоў», а можа, і натхніцца ўсё ж гэтай кінагісторыяй на пераасэнсаванне ўласнага жыцця. Паказ яе адбудзецца 7 ліпеня на тэлеканале «НТБ-Беларусь».

**Алена ДРАПКО.**


## Лета ў радасць са «Звяздой»!

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на III квартал або на II паўгоддзе 2024 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 12 ліпеня 2024 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.



Сярод падпісчыкаў будуць разыграны сем мангалаў Forester BC-779 (+6 шампуроў) і суперпрыз — вугальны грыль «Белбагемія» 101278. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце да 27 ліпеня 2024 года.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі да 30 верасня 2024 года пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на III квартал або на II паўгоддзе 2024 года. Пасля 30 верасня 2024 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні чытайце ў нумары 105 ад 31 мая 2024 года.

**Тэлефоны для даведак: (017) 271-81-53, 311-17-40.**

## Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на III квартал або II паўгоддзе 2024 года

**Прозвішча, імя, імя па бацьку** ____________________

____________________

**Падпіска афомлена і аплачана ў** ____________________
*(аддзяленне сувязі)*

**на III квартал або II паўгоддзе 2024 года**

**Хатні адрас і тэлефон** *(абавязкова)* ____ *(індэкс)* ____

____________________

____________________

**Удачы ў розыгрышы!**